контролировать свою речь, то нельзя ожидать свободного и выразительного пения. Поэтому одной из наиболее интересных форм работы в данном направлении считаем ритмодекламацию – четкое произнесение текста в заданном ритме: дети любят ритмодекламацию на фоне звучания мелодии или звучащих жестов (хлопки, шлепки, притопы); этот вид деятельности вовлекает в работу всех детей, даже плохо поющих. Ритмодекламация развивает у детей чувство уверенности в себе, осознание своей значимости в детском коллективе.

В моей работе применяется еще одна необычная и оригинальная форма развития голоса, в которой ни один ребенок не чувствует себя поющим плохо. Этот вид игровой деятельности называется рисование голосом. На начальной стадии детям предлагается изобразить голосом завывание ветра или вьюги, полет жука, комара, пчелы, шорох листьев, капли дождя и т.д., а в дальнейшем дети «скользят» голосом по нарисованным линиям. Этот способ учит ребенка самостоятельно управлять линией движения голоса, направляя ее так, как он может. Дети любят рисовать волны, катание с горы, взлет птицы и многое другое.

Существует разнообразие методов и приемов для развития певческих навыков у воспитанников 5–6 лет. Организуя работу в данном направлении, необходимо проводить ее систематически и последовательно, учитывать возрастные возможности развития детей, тесно взаимодействовать с педагогическими работниками учреждения и родителями (законными представителями). Для качественной реализации образовательного процесса по образовательной области «Музыкальное искусство» целесообразно не только изучить материалы по обучению детей пению, но и сформировать аутентичный сборник наиболее эффективных игровых упражнений. Целенаправленная и систематическая работа по развитию певческих навыков активизирует проявление интереса детей к музыкальным занятиям, исполнительскому и песенному творчеству. Воспитанники выразительно исполняют музыкальные произведения, донося до слушателей характер и смысл музыкального произведения, умеют высказать оценочные суждения о качестве собственного исполнения песни.

**Список литературы**


1. Битус, А.Ф. Певческая азбука ребенка / А.Ф. Битус. — Минск: Тетра Системс, 2011. — 96 с.
2. Емельянов, В.В. Фонопедический метод развития голоса / В.В. Емельянов. — Санкт-Петербург, 2009. — 190 с.
3. Кацер, О.В. Игровая методика обучения пению / О.В. Кацер. — Санкт-Петербург: Музыкальная палитра, 2009. — 248 с.
4. Картушина, М.Ю. Вокально-хоровая работа в детском саду / М.Ю. Картушина. — М.: 2010. — 176 с.
5. Михайлова, М.А. Развитие музыкальных способностей детей / М.А. Михайлова. — Ярославль: Академия развития, 2012. — 118 с.
6. Учебная программа дошкольного образования (для учреждений дошкольного образования с русским языком обучения и воспитания) / Мин-во образования Республики Беларусь. — Минск: Нац. ин-т образования, 2019. — 464 с.


*Дата поступления в редакцию: 25.11.2021*

# ВЫКАРЫСТАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ЦАЦКІ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ЎСТОЙЛІВАЙ ЦІКАВАСЦІ ДА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ

*Скавырка Марыя Іванаўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле раскрываюцца асаблівасці развіцця беларускага маўлення ў дзяцей дашкольнага ўзросту ў спецыфічнай сацыялінгвістычнай сітуацыі руска-беларускага роднаснага двухмоўя. Прадстаўлены вопыт работы па выкарыстанні беларускай народнай цацкі для фарміравання ўстойлівай цікавасці да беларускай мовы.*

Цяжка пераацаніць унікальнае значэнне роднай мовы ў станаўленні чалавека. Я. Колас пісаў, што “родная мова — гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет” [4].

Дашкольны ўзрост з’яўляецца самым спрыяльным перыядам для актыўнага маўленчага развіцця дзяцей. Менавіта ў гэты час адбываецца фарміраванне вуснай мовы і навыкаў маўленчых зносін. Аднак дзіця, якое жыве ў грамадстве, дзе актыўна функцыяніруюць дзве дзяржаўныя мовы (руская і беларуская), адчувае на сабе ўплыў наступстваў праблемы двухмоўя: акрамя мовы, на якой размаўляюць бацькі і суседзі, а таксама вядзецца адукацыйны працэс ва ўстанове дашкольнай адукацыі, маленькі чалавек на працягу свайго жыцця павінен засвоіць і другую мову. Для вялікай колькасці дзяцей другой мовай з’яўляецца беларуская.

Часцей беларускай мовай дзеці авалодваюць не ў сям’і, не ў працэсе актыўных зносін з блізкімі людзьмі, а ва ўмовах спецыяльна арганізаванай дзейнасці

ва ўстанове дашкольнай адукацыі. У сувязі з гэтым узрастае роля дашкольнай установы, на якую ўскладваецца адказнасць не толькі за развіццё камунікатыўных навыкаў у дзіцяці, але і фарміраванне ўстойлівай цікавасці да беларускай мовы, а праз яе – да нацыянальный гісторыі і культуры.

Развіццё маўлення дзіцяці, авалоданне багаццем роднай мовы, літаратуры, мастацтва – асноўныя элементы фарміравання асобы, нацыянальнай самасвядомасці дашкольніка, далучэння яго да вытокаў нацыянальнай культуры. Таму асаблівую ўвагу ў рабоце з дзецьмі дашкольнага ўзросту неабходна надаваць развіццю іх беларускага маўлення, умення выражаць свае думкі, пачуцці, эмоцыі на нацыянальнай мове. Гэта галоўныя задачы дашкольнай адукацыі ў гэтым накірунку дзейнасці, і ў іх вырашэнні зацікаўлены ўсе ўдзельнікі адукацыйнага працэсу дашкольнай установы.

Сучасныя навукоўцы Дубініна Д.М., Старжынская Н.С. разглядаюць народную цацку як сродак далучэння дзяцей да нацыянальнай культуры, фарміравання маральных якасцей, камунікатыўных уменняў і навыкаў. Так, на думку Д.М. Дубінінай, "самым істотным кампанентам гульні выступае цацка (у тым ліку і народная). Яе асноўнае прызначэнне — даць дзіцяці магчымасць актыўна дзейнічаць, выражаць свае думкі і пачуцці, ствараць задуманыя вобразы" [1, с. 96].

Народная цацка, як ніякі іншы прадмет, патрабуе ад дзіцяці пошукава-арыеціровачнай, творчай дзейнасці, у ходзе якой закладваюцца і праяўляюцца найважнейшыя стваральныя здольнасці — прадукцыйнае ўяўленне, спасцігальнае мысленне, арыентацыя на пазіцыю іншага чалавека, адвольнасць, элементы рэфлексіі і інш. Народная цацка, ставячы перад дзіцём розныя гульнявыя задачы, спрыяе развіццю яго пазнавальных працэсаў, гэта значыць служыць мэтам разумовага навучання. Пазнавальная каштоўнасць цацкі для дзіцяці заключаецца ў тым, што яна ў даступнай форме адлюстроўвае з'явы рэальнага свету, дапамагае дзіцяці пазнаваць навакольны свет, прывучае яго да мэтанакіраванай, асэнсаванай дзейнасці, спрыяе развіццю вобразнага мыслення, памяці, мовы, эмоцый, аказвае жывое ўздзеянне на ўспрымальную душу выхаванца.

У наш час народная цацка прысутнічае ў сучаснай установе дашкольнай адукацыі, але амаль не выкарыстоўваецца ў самастойных гульнях дзяцей. Між тым, як створаны дарослымі для развіцця дзяцей прадмет культуры цацка мае адукацыйнае і выхаваўчае значэнне толькі тады, калі выкарыстоўваецца па прызначэнні — у гульнявой дзейнасці. Дзіця павінна разумець цацку, хацець творча з ею дзейнічаць. Тады цацка, як і гульня, будзе спадарожнікам дзяцінства.

Ужыванне ў практыцы работы з дзецьмі традыцыйнай беларускай цацкі ўплывае на фарміраванне ў дзяцей устойлівай цікавасці да роднай мовы, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці.

Арганізацыя работы ў старшай групе па адукацыйнай галіне "Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін" патрабуе ад педагога асаблівай увагі. Адукацыйны працэс у групе ажыццяўляецца на рускай мове. Назіранні за дзецьмі паказалі, што толькі некалькі з іх у групе праяўляюць устойлівую цікавасць да маўлення на беларускай мове: актыўна адказваюць на пытанні, імкнуцца далучыць да маўлення іншых дзяцей і звяртаюцца з просьбай пачытаць беларускія народныя казкі. Узнікае пытанне: "Як павысіць цікавасць да роднай мовы?" А самае галоўнае — як стварыць пэўныя ўмовы для арганізацыі навучання, выхавання і развіцця дзіцяці на беларускай мове?

Работа пачынаецца з папаўнення развіццёвага прадметна-прасторавага асяроддзя групы рознымі відамі народнай цацкі (гліняныя, саламяныя цацкі). Для таго, каб выклікаць найбольшую цікавасць да цацак, можна стварыць іх сваімі рукамі сумесна з дзецьмі. Перавага аддаецца цацкам — выявам знаёмых дзецям хатніх жывёл і птушак з ільну, дрэва, гліны. Асаблівасцю гэтых цацак з'яўляецца прастата выканання, выразнасць і лаканізм вобразаў.

З цягам часу захапленне стварэннем цацак абумовіла ўзнікненне многафункцыянальнага метадычнага дапаможніка "Цацачны панадворак". Выкананы з пяшчотай і любоўю, ён змяшчае вобразы жывых натуральных прадметаў і эфектыўна выкарыстоўваецца ў адукацыйным працэсе. (Малюнак).




Малюнак. — Многафункцыянальны метадычны дапаможнік "Цацачны панадворак"

Наступнай задачай было наладзіць адукацыйны працэс такім чынам, каб выклікаць цікавасць да роднай мовы праз выкарыстанне цацак, якія былі выраблены выхавацелем. Для гэтага распрацавана перспектыўнае планаванне работы на навучальны год па выкарыстанні "Цацачнага панадворка", якое ўключае розныя віды гульняў, заняткі, выставы, экскурсія, моўныя хвілінкі, гутаркі, забавы.

Для таго, каб прыцягнуць увагу дзяцей да народнай цацкі, прапануюцца гульні-знаёмствы з цацкамі *"Будзем знаёмы"*, *"Здагадайся, хто я?"*. Дзеці знаёмяцца з пэўнай цацкай і выконваюць заданні — даюць назву, вызначаюць, з чаго зроблена, як з ёй можна гуляць. А калі дзеці не могуць справіцца з пастаўленай задачай, пра цацку разказвае дарослы. У час гульні *"З чаго зро-*

*блена цацка”* пашыраюцца веды дзяцей аб матэрыялах, з якіх зроблены цацкі: дрэва, гліна, салома, лён.

Пасля знаёмства дзяцей з цацкамі яны складаюць невялікія апавяданні або загадкі пра цацку. Выкарыстоўваюцца праблемныя сітуацыі, якія выклікаюць у дзяцей усвядомленае жаданне даведацца, як гэта называецца па-беларуску. *Напрыклад, у цацачным магазіне працуе лялька Паўлінка, якая прадае цацкі толькі таму, хто правільна назаве іх па-беларуску.*

Пры ўвядзенні новага беларускага слова неабходна пазбягаць перакладу з рускай мовы, а называць прадмет адразу па-беларуску. Гэта садзейнічае развіццю моўнамысліцельнай дзейнасці на беларускай мове. Для паступовага ўвядзення беларускай мовы ў розныя віды дзейнасці выхаванцаў таксама выкарыстоўваюцца цацкі. Дзеці ўжо разумелі: калі звяртаемся да пэўнай цацкі, значыць, будзем размаўляць на беларускай мове.

Цацкі па адным або разам “прыходзілі” да дзяцей і цікавіліся іх заняткамі, гульнямі, размаўляючы толькі па-беларуску, задавалі пытанні, называлі асобныя прадметы, якія знаходзяцца ў дзяцей, выконвалі розныя дзеянні з імі, расказвалі нескладаныя гісторыі, казкі. Такім чынам, наладзіліся камунікатыўныя зносіны дзяцей на беларускай мове.

Маўленчыя сітуацыі, пабудаваныя на цікавасці дзяцей да цацак, ствараюць установку: дзеці вучацца прыслухоўвацца да беларускай мовы, успрымаць і разумець яе. Непрыкметна ў іх фарміруецца патрэба часцей ўжываць родную мову. Падчас такіх заняткаў засвойваецца слоўнікавы запас. Спачатку пасіўны, ён паступова актывізуецца, калі дзеці пачынаюць прымаць удзел у сітуацыйным дыялогу з лялькамі і выхавальнікам. У гэтых дыялогах дзеці практыкуюцца ў вымаўленні слоў беларускай мовы.

У старэйшым дашкольным ўзросце дзеці не толькі любяць гуляць з цацкамі, але і цікавяцца спосабамі вырабу цацак. Разам з дзецьмі ператвараемся ў майстроў-умельцаў і вучымся вырабляць самыя простыя цацкі.

У працэсе працоўнай дзейнасці паглыбіліся навыкі работы з глінай, тканінай, ніткамі. Гэта дазволіла развіць дзіцячую творчасць па матывах народнага мастацтва. Дзеці вучыліся сіметрычна размяшчаць раслінныя элементы арнаментаў спачатку на плоскіх сілуэтах вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (адзенне, посуд), а потым — ствараць фігуркі птушак, жывёл, звяроў. Асабліва яркія ўражанні засталіся ў дзяцей ад вырабу беларускай лялькі Берагіні з тканіны. Раней яна аберагала нашых продкаў ад розных няўдач і няўзгод.

Моцныя ўражанні ў дзяцей вызвала экскурсія ў Шаркаўшчынскі раённы цэнтр рамёстваў. Дзецям была прадстаўлена выстава “Беларуская народная цацка”. Падчас экскурсіі майстры-ўмельцы расказалі дзецям пра розныя віды цацак. Дзеці актыўна і з захапленнем адказвалі на пытанні, пры гэтым размова адбывалася на беларускай мове.

Цікавасць да цацак і беларускага маўлення замацоўваецца падчас заняткаў лепкай, маляваннем. Дзеці з задавальненнем ляпілі або малявалі цацкі, а потым самі прапанавалі зрабіць выставу ў групе “Мае любімыя цацкі”.

Станоўчыя эмоцыі вызваў прыход у дзіцячы сад майстра-ганчара з Цэнтра рамёстваў, які правёў майстар-клас па лепцы цацак з гліны.

Дапамагаюць прывіць цікавасць да роднай мовы тэксты беларускіх народных казак *”Кот Максім”, ”Пра быка і яго сяброў”, ”Селянін, Мядзведзь і Лісіца”, ”Як воўк звяроў напалохаў”, ”Лёгкі хлеб”, ”Лісіца-хітрыца”.* Каб працэс ўспрымання быў больш цікавым, кожны раз казку расказвае “Кот-казачнік” або іншая цацка.

Немагчыма дасягнуць добрых вынікаў без наладжанай работы з бацькамі. У распранальным пакоі змешчаны куток для бацькоў *“Моўная палічка”*, якая дае магчымасць дарослым і дзецям адчуць смак роднай мовы ва ўмовах сям'і. На палічцы змяшчаны маленькія вершаваныя формы, паэтычныя радкі з вершаў беларускіх паэтаў і фальклорныя творы: прыказкі, прымаўкі, загадкі, з якімі дзеці знаёміліся ў садку. Па форме яны яскравыя, дасціплыя, забаўныя. Усе яны падабаюцца дзецям, лёгка завучваюцца на памяць.

Дзякуючы плённай і мэтанакіраванай рабоце па далучэнні дзяцей да роднай мовы, узнікла думка прапанаваць бацькам разам з іх дзецьмі паспрабаваць сябе ў ролі стваральнікаў і “ўзяцца за пяро” па напісанні невялікіх вершаў на беларускай мове пра цацкі з панадворка. Вершы дапамаглі развіць мысленне і ўяўленне, узбагацілі станоўчыя эмоцыі, развілі цікавасць да роднага слова. Таксама было праведзена “Свята цацкі”, на якім у выкананні дзяцей гучалі вершы, інсцэніроўкі, складзеныя дзецьмі і бацькамі. Каб захаваць у памяці творчыя намаганні нашых бацькоў і дзяцей, было вырашана сабраць вершы ў невялікую дзіцячую кніжку, дзе змясцілі вершы і здымкі пра жывёл. Кніжка “Цацачны панадворак” з'явілася сведчаннем завершанасці працэсу працы і прызнання каштоўнасці фантазіі дзіцяці.

У дзяцей пры навучанні роднай мове з'яўляецца ўстойлівая цікавасць і станоўчыя адносіны да беларускай мовы, жаданне ёй авалодаць. Акрамя таго, у выхаванцаў фарміруюцца пазнавальныя і моўныя здольнасці, памяць, увага, маўленчая актыўнасць, назіральнасць адносна моўных з'яў. Дзеці пачынаюць з задавальненнем слухаць творы беларускага фальклору: забаўлянкі, казкі, песенкі, лічылкі. Дзеці імкнуцца даведвацца, як трэба казаць па-беларуску пэўныя словы, ведаюць прыёмы беларускага этыкету, карыстаюцца імі. У кніжным кутку выхаванцы часта сталі выбіраць для разглядання кнігі з беларускімі казкамі, звярталіся з просьбай пачытаць беларускія творы. Дзеці пачалі выкарыстоўваць сюжэты знаёмых твораў падчас гульняў з настольным тэатрам. Пры гэтым дыялогі казачных герояў яны стараліся перадаваць па-беларуску.

У бацькоў пашыраюцца веды пра развіццё беларускага маўлення дзяцей ва ўмовах установы дашкольнай адукацыі, сфарміравалася ўяўленне пра змест работы з дзецьмі ў гэтым напрамку.

Выкарыстанне беларускай народнай цацкі пры-

несла добрыя вынікі для развіцця беларускага маўлення выхаванцаў. “Цацачны панадворак” дапамог далучыць не толькі дзяцей, але і іх бацькоў да багацця беларускай мовы, сфарміраваць каштоўнасныя адносіны да яе. Выкарыстанне цацак, зробленых сваімі рукамі, садзейнічала фарміраванню цікавасці дзяцей да маўлення на роднай мове, як на занятках, так і пры правядзенні забаў, рэжымных момантаў, у час гульнёвай дзейнасці.

Нельга не адзначыць і ролю “Моўнай палічкі”. Яна дапамагла бацькам бліжэй пазнаёміцца з асаблівасцямі адукацыйнай работы ва ўстанове дашкольнай адукацыі, убачыць вынікі ад сумесных намаганняў. А кніга вершаў пра цацкі з “Цацачнага панадворка” з’явілася сапраўдным падарункам для выхаванцаў.

Выкарыстанне народнай цацкі для развіцця ўстойлівай цікавасці да беларускай мовы ва ўмовах установы дашкольнай адукацыі здольна павысіць эфектыўнасць адукацыйнага працэсу, развіць устойлівую цікавасць да беларускай мовы, асабліва калі ўдзел у гэтай працы прымаюць зацікаўленыя дарослыя — выхавацелі і бацькі.

## Спіс літаратуры

1. Дубініна, Д.М. Народная цацка як сродак дачынення дзяцей дашкольнага ўзросту да культурнай народнай традыцыі / Д.М. Дубініна // Педагогическая наука и образование : ежеквартальный научный журнал / учредители: Научно-методическое учреждение «Национальный институт образования» Министерства образования Республики Беларусь, Общественное объединение «Белорусское педагогическое общество». — 2013. — № 2. — С. 96–98.

2. Дубинина, Д.М. Выхаванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту цікавасці да беларускай мастацкай літаратуры і фальклору : дапаможнік для педагогаў устаноў дашк. адукацыі / Д.М. Дубініна. — Мінск : Новое знание, 2016. — 208 с.

3. Кашынская, І. Свята беларускай народнай цацкі / І. Кашынская, Н. Акуловіч // Пралеска. — 2018. — № 4. — С. 51–52.

4. Нацыянальная бібліятэка Беларусі: Выслоўі, выказванні, афарызмы беларускіх песняроў [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://www.nlb.by/by/infarmatsyynyya-resursy/elektronnyya-infarmatsyynyya-resursy/resursy-natsyyanalnay-bibliyateki-belarusi/. — Дата доступа: 11.09.2021.

5. Старжынская, Н.С. Вучымся гаварыць на роднай мове: вуч. нагл. дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі / Н.С. Старжынская, Дз.М. Дубініна. — Минск: Новое знание, 2011.

6. Старжынская, Н.С. Народная цацка — люстэрка культуры / Н.С. Старжынская, Дз.М. Дубініна // Пралеска. — 2011. — № 8. — С. 26–32.

7. Старжынская, Н.С. Сучасныя падыходы да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту / Н.С. Старжынская // Пралеска. — 2016. — № 10. — С. 3–8.

*Дата поступления в редакцию: 26.11.2021*